# НАША БРАЦКАЯ ДАПАМОГА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

## *Гутарка Старшыні Соўнаркома БССР тав. К. В. Кісялёва з карэспандэнтам „Звязды“*

Я наведаў Гродна, Беласток, Ваўкавыск, Маладзечна, Баранавічы, а таксама рад паветаў і сёл Заходняй Беларусі, вызваленай нашай доблеснай Чырвонай Арміяй.

Усюды, дзе мне прыходзілася бываць, працоўныя гарадоў і вёсак горача віталі вызваленне іх ад гнёту векавечнага ворага беларускага народа — польскіх магнатаў, памешчыкаў і капіталістаў. Працоўныя Заходняй Беларусі ў гэтыя радасныя дні ў размовах, на сходах выражаюць гарачую падзяку правадыру і настаўніку таварышу Сталіну.

Паўсямесна ў Заходняй Беларусі ідзе раздзел памешчыцкіх зямель паміж сялянамі. У першую чаргу зямлёй надзяляюцца сяляне-беднякі і батракі; сяляне, якія не маюць кароў і коней, атрымліваюць іх з былых памешчыцкіх маёнткаў.

У Несвіжы мне прышлося пабываць у былым маёнтку аднаго з буйнейшых магнатаў панскай Польшчы князя Радзівіла. Гэты князь трымаў у ярме многа дзесяткаў беларускіх вёсак, бязлітасна эксплаатаваў сялянства, выціскаючы з яго апошнія сокі. Цяпер у гэтым маёнтку, у выдатным замку, акружаным валам, сажалкамі, садамі, арганізуецца музей з карціннай галерэяй, з выстаўкай старадаўняй зброі. Выдатны замак, у якім жыла толькі адна сям'я магната, стаў дастаяннем народа. Усе культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца ў замку, поўнасцю захаваны.

…ця, былі пазашколай. З 1.200 школьных будынкаў 95 проц. з'яўляліся непрыгоднымі для вучобы маленькімі, цёмнымі, нізкімі, сялянскімі хатамі. Расказы аб нашых выдатных сталінскіх школах, гэтых сапраўдных палацах культуры, дзе многа святла і сонца, прыводзілі ў захапленне працоўных Заходняй Беларусі.

Наркамасветы БССР прымае рад практычных мер для наладжвання нармальнай работы школ у Заходняй Беларусі на роднай мове і для ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва.

У Заходняй Беларусі, на Палессі, яшчэ захаваліся такія хваробы, як калтун, якія ў Савецкай Беларусі даўно ліквідаваны. Сярод збяднелага насельніцтва многа хворых трахомай, туберкулёзам і т. д. Панская Польшча зусім не клапацілася аб здароўі працоўных.

Органы аховы здароўя БССР паслалі санітарна-эпідэмічныя атрады, якія праводзяць вялікую работу па аказанню медыцынскай дапамогі насельніцтву. Днямі адпраўлена значная партыя медыкаментаў 45 назваў, у тым ліку такія дэфіцытныя там медыкаменты, як хлараформ, эфір і інш. Адпраўлена 1 тона гіграскапічнай ваты, 100 тыс. бінтоў для перавязак і т. д.

Лепшыя майстры мастацтва Савецкай Беларусі ў гэтыя радасныя дні выступалі перад працоўнымі вызваленай Заходняй Беларусі. Туды выязджала брыгада …

…тыя фільмы, заўсёды перапоўнены. Паяўленне на экране вобразаў любімых правадыроў Леніна і Сталіна сустракаецца працоўнымі поўнымі захаплення авацыямі. Гледачы, падымаючыся з месц, горача апладыруюць у чэсць таварыша Сталіна, у чэсць гераічнай Чырвонай Арміі і яе жалезнага палкаводца Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

У Заходнюю Беларусь для абслугоўвання часцей Чырвонай Арміі і насельніцтва накіраваліся 70 аўтакінаперасовак, у тым ліку аўтаколона з 10 кінаперасовак для абслугоўвання сельскага насельніцтва. Нашы рухавыя аўтакінаперасоўкі пранікаюць у самыя аддаленыя сёлы і мястэчкі Заходняй Беларусі, у такія месцы, дзе насельніцтва ніколі не бачыла кіно.

Зараз у Навагрудку і іншых месцах арганізуюцца базы кінапраката і спецыяльныя кінарамонтныя майстэрні. Для Заходняй Беларусі выдзелен дадаткова фонд з 347 карцін.

Заходняя Беларусь не ведала ўстаноў па сацыяльнаму забеспячэнню. Панская Польшча зусім не цікавілася лёсам старыкоў, непрацаздольных, інвалідаў працы. У гарадах і сёлах можна сустрэць многа жабракоў, беспрацоўных, людзей, якія жывуць міластыняй. Працоўныя Заходняй Беларусі толькі зараз даведваюцца аб велізарных асігнаваннях Савецкай дзяржавы на сацыяльнае забеспячэнне працоўных, аб выключных клопатах …

…насельніцтва крыніцай нішчаты, бескультур'я, ачагом цяжкіх хвароб. Цяпер у горад Пінск накіравана камісія са спецыялістаў — меліяратараў, лесаводаў і аграномаў з мэтай вывучэння гэтых велізарных балотных і лясных масіваў для іх гаспадарчага скарыстання. Ва што могуць быць ператвораны дзікія балоты, ярка паказвае прыклад савецкага Палесся, дзе на месцы непраходных балот паявіліся квітнеючыя калгасныя палі, якія даюць рэкордныя ўраджаі зерневых і тэхнічных культур. У БССР асушаныя балоты сталі крыніцай культурнага і заможнага жыцця калгаснага сялянства. Велізарныя дасягненні калгаса імені Беларускай Асобай Ваеннай Акругі Любаньскага раёна паказаны на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Гэты калгас у рэзультаце асушкі балот стаў адным з квітнеючых куткоў ордэнаноснай БССР. Там ёсць нават свая калгасная чыгунка.

Перад Палессем Заходняй Беларусі адкрываюцца велізарныя перспектывы. Тут намячаюцца вялікія меліярацыйныя работы, распрацоўка торфу, лясоў. Гэты багацейшы край паступова будзе засяляцца. У даны момант вывучаюцца архівы, звязаныя з абследваннямі Пінскіх балот. У прыватнасці, матэрыялы экспедыцыі генерала Жылінскага, праведзенай многа дзесяткаў год назад.

Вялікі эканамічны і навуковы інтарэс …

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы